# Пошта са званком.

Усе гулякі садзяцца ў кола або ў рад і вадзячы пачынае гульню, кажучы: „Дзылін, дзылін!" Яго пытаюць: „Хто там?" „Пошта," адказвае вадзячы. „Адкуль?" пытаюць яго. „З горада" (і называе які колечы горад, прыкл. Менск, Вільня, Бабруйск і інш.) „А што там робяць?" пытаюць яго. Вадзячы кажа, што хоча: скачуць, пішуць, пяюць і г.д. Як толькі вадзячы скажа, што у горадзе робіцца, усе гулякі павінны рабіць тое самае, што сказана. Гуляка, які празявае, плаціць фант і выходзіць з гульні.

# Якуб, угадай

Вадзячы з завязанымі вачыма сядзіць у коле, а рэшта гулякоў узяўшыся за рукі ходзяць навакола й пяюць, або гавораць:

„Сядзі, сядзі, Якуб,
Пад гарэхавым кустом;
Грызі, грызі, Якуб,
Гарэхі смачныя.
Прыйдзе час — адгадай,
Вярней імя называй!

Пасьля гэтых слоў усе садзяцца на падлогу або на зямлю і вадзячы ошчупам рук угадвае, хто перад ім сядзіць; калі ўгадаў, то Якубам робіцца адгаданы, калі не ўгадаў, то гульня працягваецца з тым самым Якубам.

# Прыказкі.

Выбіраецца ўсім ведамая прыказка, з якой кожны гулака бярэ сабе адно слова. Вадзячы павінен адгадаваць прыказку. Ён падыходзіць да кожнага з гулакоў і задае ім якія-колечы пытаньні. Яны павінны адказаваць так, каб у адказе абавязкова было ўзятае ім слова. Адказваючы трэба старацца так гаварыць, каб не зьвярнуць увагі вадзячага на ўзятае слова. Вадзячы можа або перапытаць усіх, і тады ўжо адгадаваць прыказку, або можа адгадаваць слова кожнага гулакі. Першы гулака, якога слова адгадана вадзячым, становіцца вадзячым, калі вадзячы ўгадае ўсю прыказку. Калі ж вадзячы ня можа адгадаць і адмаўляецца, то яму гавораць усю ~~нас~~ прыказку, і ён павінен ізноў адгадаваць другі раз. Трэба глядзець, каб гулакі не давалі вельмі вялікіх адказаў.

# Рамясьнікі.

Усе гулякі дзеляцца на дзьве партыі. Адна партыя водзіць, а другая загадвае якое-колечы рамяство й „вытварае" (воспроізводзіць) яго паказваючы рукамі, нагамі, або галавою.

Ваджачая партыя павінна ўгадаць, што задумана. Адгадаваць можна да 2 ці 3 разоў, як умаўляюцца. Калі ўгадаюць, то партыі мяняюцца ролямі.

## Сказ аб агульнае сачыненьне.

Кожны з гульцоў атрымлівае карандаш і доўгую паску паперы, на якой піша чыё-колечы імя з прысутных, і загібае паперку так, каб ня відаць было, што напісана і перадае другому гульцу; той піша імя жаноцкае так сама з прысутных, загібае паперку ізноў і перадае трэцяму і т.д. Трэйці піша дзеяньне, чацьверты-месца, пяты-прычыну, шосты рэзультат і т.д. Урэшце гучна чытаюць напісанае. Пад час выходзіць вельмі смешна, прыкл.: Янка і Зося забіраюць ягады пад мостам, каб спадабацца козьліку і т.д.

Гэтакім парадкам можна складаць цэлыя творы на тую ці іншую тэму.

# Падарожа.

Адзін з гулякоў выбіраецца падарожнікам, а рэшта называюцца іменамі гарадоў. Усе рассаджаваюцца дзе і як папала, а падарожнік выходзіць на сярэдзіну і расказвае аб сваёй падарожы, упамінаючы імены гарадоў, прыкл.: „Праездам я застанавіўся у Менску, а адтуль па справам паехаў у Вільню, тут пажыў пару дзён і выехаў у Магілеў - і т. д. Як толькі падарожнік назаве які горад, гуляка, які завецца гэтым горадам павінен устаць і памяняцца месцамі з другім, якога падарожнік назаве горадам, а падарожнік стараецца заняць пустое месца. Хто астаўся без месца, робіцца падарожнікам. Калі падарожніку не ўдалося заняць месца, ён працягвае свой расказ. Падарожнік можа сказаць: „я праехаўся па ўсіх гарадох і тады ўсе гулякі мяняюцца месцамі.

# Тэлефон.

Усе гулякі садзяцца ўрад, і крайні-станцыя гаворыць на вуха свайму суседу якое-колечы слова, або сказ, той так сама на вуха перадае гэтае слова свайму суседу і г. д. да апошняга. Затым усе павінны сказаць, што чуў; першы, перапутаўшы сказанае слова, садзіцца на самы канец, а рэшта гулякоў, такім чынам блі-жыцца к станцыі і пачарзе тэлефануюць. Кожны тэлефануе па тры разы, пасьля чаго садзіцца на канец.

Гульня вельмі забаўная, выклікае агульны сьмех, бо рэдка калі слова верна паўтараецца да апошняга, звычайна у другога ці трэцяга гулякі выходзіць зусім не тое, што сказана першым.

## Склады.

Адзін з гульцоў кідае хусткачку другому й гаворыць які-колечы склад, прыкладам — та; той павінен дакончыць слова і прыкладам кажа — та або ...лерка і г. д. Затым ен кідае хусткачку трэйцяму й гульня працягаваецца такім самым парадкам. Хто хутка не ~~скажа~~ дакончыць слова, або скажа непадладзячы склад, — плаціць фант.

## Пісьмо.

Кожны гульца на кусочку паперы піша які-колечы сказ, годны для пісьма. Затым усе паперкі мяшаюцца, і хто-колечы адзін падбірае іх так, каб з гэтых сказаў склалася пісьмо і гучна чытае.